# СТАНАЎЛЕННЕ НАТАРЫЯТА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Л. А. Лукша, В. М. Лянцэвіч

Гісторыя інстытута натарыята мае старажытныя карані і бярэ свой пачатак са Старажытнага Рыма. Тэрмін «натарыят» паходзіць ад лац. слова nota – «знак». Слова «натарыус» азначала «пісец», «хуткапісец». Натарыусамі называлі людзей, якія пакідалі праекты здзелак і для хуткасці запісу ўжывалі стэнаграфічныя знакі. Бліжэй да заняпаду Рымскай рэспублікі (II–I ст. да н.э.) была распрацавана сістэма стэнаграфічных знакаў для хуткага запісу дагавораў [1, s. 7–8].

Ускладненне грамадска-маёмасных адносін, з'яўленне патрэбы ў законным афармленні зямельных уладанняў стала штуршком для пачатку фарміравання на беларускіх землях у Сярэднявеччы інстытута натарыята.

Ва ўсе часы натарыят адыгрываў значную ролю ў жыцці дзяржавы і грамадства, абараняючы правы і законныя інтарэсы грамадзян, забяспечваючы стабільнасць эканамічнай дзейнасці. Нягледзячы на тое, што інстытут натарыята здабыў статус самастойнага прававога інстытута ў 1866 г., гісторыя натарыяльнай дзейнасці ў нашай краіне налічвае шмат стагоддзяў.

За некалькі стагоддзяў існавання натарыят прайшоў доўгі і складаны прафесійны шлях. Першапачаткова натарыяльнае развіццё адбывалася па трох напрамках: царкоўны, натарыят органаў улады розных узроўняў і судовых органаў.

Першыя згадкі асоб, якія выконваюць функцыі натарыуса, датуюцца X–XI ст. Гэта звязана з прыняццем хрысціянства, таму і развіццё натарыята на беларускіх землях напрамую звязана з хрысціянскай царквой. У Старажытнарускай дзяржаве яго ведаму падлягалі практычна ўсе сямейныя справы: справы, звязаныя з ўспадкоўваннем, падзелам маёмасці [1, s. 294]. Захоўванне дагавораў і іншых дакументаў адбывалася ў праваслаўных храмах [1, s. 433].

Далей элементы натарыяльнай дзейнасці заўважаюцца ў XVI ст., калі тэрыторыя нашай краіны ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). У гэты перыяд яшчэ не сустракаюцца тэрміны «натарыус» або «інстытут натарыята». Аднак ва ўстановах дзяржаўнага і судовага апарату ВКЛ ў XIV–XVIII ст. існуюць службовыя асобы, якія выконваюць натарыяльныя функцыі.

У дастатутны перыяд (XIV–XV стст.) ў Падляшшы земскія пісары мелі права зацвярджаць здзелкі, перадачу спадчынных правоў і іншыя дзеянні, надзяляючы іх юрыдычнай сілай. Галоўны від дзейнасці пісара – пісьмовае сведчанне прыватных дагавораў. Зрэшты, паслугі пісараў у ВКЛ не знайшлі шырокага прымянення. Як можна меркаваць па наяўных параўнальна нешматлікіх дадзеных, часцей за ўсё яны рыхтавалі дакументы адной разнавіднасці – тэстаменты [2, с. 127]. У земскіх судах пісары замкавыя вялі запісы аб закладных здзелках у судовых рэестрах (кнігах).

Вытокі юрыдычнага замацавання натарыята на беларускіх землях можна выразна прасачыць у развіцці статутаў ВКЛ. Напрыклад, у першым Статуце 1529 года арт. 15 разд. V «Аб апекунах» замацавана: «А коли бы хто на речы свои рухоме або на именье, на куплю хотел тестамент чинити, тогды таковой, хотя бы теж немоцон, будет речы свои имене купленое таковое отказывати, куды хочет, как духовным персонам, яко и светским, призвавши к тому каплана або иные светки, або люди веры годные, або теж явного писара присяжного» [3, с. 54].

У арт. 2 раздзеле IV «Аб загалоўку жаночым і пра выправу дзевак» рэгуляваліся натарыяльныя дзеянні ў сферы спадчынных правоў, а менавіта парадак атрымання ўдавой маёмасці пасля памерлага мужа: «Вдова, которая седит на вдовем столцы, а будет ли венована от мужа своего, а сынове мают доросле, тогды мает осести толко на вене, а сынове мают припущоны быти ко всим именям и скарбом отцовским, которые мают службу земскую заступати. Пакли не венована будет от мужа своего, тогды мает во всем ровную часть от детей дорослих лет своих мети у скарбах и у именях рухомых и лежачих» [3, с. 48].

У нормах Статута 1529 г. можна прасачыць падзел маёмасці на рухомую і нерухомую, таксама характарыстыкі асоб, якія могуць скласці тэстамент і на каго ён можа быць складзены.

Прыняцце Другога Статута ў 1566 г. сведчыць аб значным развіцці судовага натарыята. Статутныя нормы раздзела IV «Аб суддзях і пра суды» ў арт. 1, 2 рэгламентавалі парадак абрання земскіх пісараў, вялікакняжацкіх натарыусаў. Ад кожнага павета з 12 кандыдатаў на павятовым сойміку Вялікі князь абіраў на тры гады «чотырохъ людей добрыхъ, цнотливыхъ, ростропныхъ въ правѣ у мѣстныхъ, роду шляхецского, въ томъ повѣтѣ добрѣ оселыхъ, не иное вѣры только Хрестіянское»; якія захоўвалі пячатку павета [4, с. 96]. Прэтэндаваць на судзейства не маглі духоўныя асобы, старасты, дзяржаўцы; цівуны, харужыя і ўраднікі павета.

У Статуце ВКЛ 1566 г. змяшчаецца тэкст прысягі, якую прыносіў пісар перад старастай Жамойцкім у прысутнасці шляхціцаў. Раздзел VIII «Аб тэстаментах» у арт. 1 сведчыць аб тым, што *«кождый маеть мѣти моцъ о речахъ своихъ рухомыхъ тестаментъ чинити»* [4, с. 158]. Выключэнне складалі асобы, якія былі пералічаны ў Статуце 1529 г.

Парадак правядзення здзелак і нормы грамадзянска-працэсуальнага права ўтрымліваліся ў раздзеле VII «Аб запісах і продажах». Здзейсненыя здзелкі захоўваліся ў спецыяльных актавых запісавых кнігах.

Прагрэсіўнай асаблівасцю для таго часу было з'яўленне ў якасці дадатка да Статута 1566 г. найбольш патрэбных узораў афармлення дагавораў дарэння мужам жонцы рухомых рэчаў, мены ўласнасці, праобразу шлюбнага дагавора, дароўным, «запіс на вечыстую продаж» маёнткаў. Развіццё гаспадарчага жыцця і ўмацаванне прыватнай уласнасці ў ВКЛ спрыяла выхаду справаводства на высокі ўзровень.

Пасля падпісання Люблінскай уніі 1569 г. далейшае станаўленне беларускага натарыята амаль да 1795 г. адбываецца ў межах канфедэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай.

Статут 1588 г. працягнуў развіццё нормаў, закладзеных у Статуце 1566 г. Самым значным для развіцця судовага натарыята з'яўляецца раздзел IV «Аб суддзях і пра суды», які змяшчае 105 артыкулаў. Функцыі натарыуса ажыццяўлялі земскія суддзі, якія, як і раней, былі павінны прынесці прысягу. Статутныя нормы замацавалі прававы статус і абараняў гонар, годнасць, аўтарытэт, жыццё і здароўе суддзяў. Натарыусы былі абавязаны весці судовыя кнігі (рэестры), запісваць змест разгледжаных спраў, выдаваць копіі

Згодна статутным нормам, у выпадку хваробы, сваіх уласных спраў у іншым альбо ў тым жа павеце або адпраўкі ў амбасаду пісар павінен быў асабіста папярэдзіць аб сваёй адсутнасці на сесіях.

У паветах ВКЛ вялікая ўвага надавалася будаўніцтву архіваў і скляпоў з выстаўленнем варты для захаванасці дакументаў. Пісар мог выдаваць выпіскі з земскай кнігі, аднак яны павінны былі быць змацаваныя подпісам суддзі або падсудка. Мовай справаводства замест лацінскага стала больш даступная для дакументаў, аказваць кансультатыўную дапамогу ў складанні актаў і сачыць за іх захаванасцю.

У арт. 1-2 раздз. IV «Аб суддзях і пра суды» адзначалася, што ад прэтэндэнтаў патрабавалася мець высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі і валодаць пэўнымі маральнымі і духоўнымі якасцямі. На пасаду натарыуса разглядалася кандыдаты: «особъ шляхътичовъ, людей добрыхъ, побожныхъ, цнотливых, годныхъ, в праве умеетныхъ, писати умеючых, родичовъ того паньства, великого князства» [5, с. 60–61].

Уводзілася забарона на сумяшчэнне пасады суддзі земскага з іншымі пасадамі мясцовай адміністрацыі: «не мають быти выбираны духовные особы, ани кашталянове, маръшалъки и старостове судовые, ани подкоморые, войские, ани хоружие земъские, дворъные и поветовые и нихто таковый, который бы инъшим врядникомъ земъскимъ былъ» [5, с. 60].

У Статут 1588 г. былі ўключаны раздзелы VII «Аб запісах і продажах» і VIII «Аб тэстаментах», прысвечаныя парадку распараджэння нерухомай маёмасцю, якая была набыта на прававых падставах: «аддаць», «прадаць», «падарыць», «запісаць», «аддзяліць ад дзяцей і блізкіх». Тэстаменты складаліся ў прысутнасці ўсяго складу суда ці хаця б аднаго ўрадніка, а звесткі ў абавязковым парадку ўносіліся ў земскую кнігу.

У 1590 г. з'яўляецца пасада рэгента (сакратар канцылярыі ВКЛ), які заносіў дакументы ў кнігі Метрыкі ВКЛ і выдаваў афіцыйныя копіі-выпіскі, рэдагаваў перад падачай на подпіс каралеўскія і канцлерскія дакументы.

У канцы XVIII ст., у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі, і з тых часоў на развіццё натарыята немалы ўплыў стала аказваць расейская практыка. У 1729 г. упершыню ў Расійскай імперыі з'яўляецца пасада публічнага натарыуса, які здзяйсняў пратэсты ў непрыняцці і неплацяжах вэксаляў, заключаў дагаворы і абавязацельствы,

сведчыў «акты з'явы», пазыковыя лісты. Такім чынам была зроблена спроба аддзяліць натарыяльную частку ад судовай, з наступным фарміраваннем самастойнага інстытута. На тэрыторыі Беларусі зацвярджэнне гэтай пасады адбылося значна пазней, у 1850 г.

У XVIII–XIX ст. на тэрыторыі Расійскай імперыі існавалі натарыусы і маклеры, якія ажыццяўлялі зацвярджэнне здзелак на біржы. У Зборы законаў Расійскай імперыі ад 1857 г. было азначана: публічныя натарыусы, гарадавыя і прыватныя маклеры павінны быць людзі «во всехъ торгахъ и вексельных переводахъ искусные» [6, с. 405].

Забаранялася сумяшчэнне звання маклера і натарыуса з удзелам у гандлі. Нядоўга існуючая, але гістарычна значная, пасада публічнага натарыуса была скасавана з прыняццем Палажэння аб натарыяльнай частцы 1866 г.

Палажэнне аб натарыяльнай частцы ад 14 красавіка 1866 г. (далей – Палажэнне) – гэта заканадаўчы помнік і вельмі значнае прававое дасягненне ў гісторыі развіцця беларускага і рускага натарыята. Палажэнне пачало дзейнічаць у беларускіх губернях толькі ў 1883 г., што было абумоўлена асаблівасцямі судовай рэформы 1864 г. у Беларусі.

У выніку заканадаўчыхператварэнняў па ўзоры заходніх краін быў створаны пазасудовы натарыяльны інстытут з шырокім і незалежным колам дзеянняў, а пасада натарыуса атрымала дэталёвую рэгламентацыю. У патрабаваннях да кандыдатаў было замацавана, што «нотаріусани могуть быть только русские подданные, совершеннолѣтніе, не опороченные Судомъ или общественнымъ приговоронь и не загинающіе никакой другой должности, ни въ государственной, ни въ общественной службь» [7, с. 183]. Асоба, якая хацела займаць пасаду натарыуса, прад'яўляла характарыстыку з папярэдняга месца службы – атэстат, дзе апісваліся маральныя якасці. Палажэнне не ўсталёўвала неабходнасці мець пэўную адукацыю і не патрабавала спецыяльнай падрыхтоукі.

Супярэчнасць прававых нормаў заключалася ў тым, што прафесія «натарыус» атрымала статус дзяржаўнага служачага з прысваеннем 8 класа, але без права на перавод у чыны і без права на пенсію.

Палажэннем 1866 г. была ўстаноўлена абавязковая натарыяльная форма для здзелак з нерухомай маёмасцю, дзе натарыус у прысутнасці 2 сведак выступаў гарантам прыватнай уласнасці. Ён павінен быў засведчыць асобы бакоў пры заключэнні здзелкі, іх волю, дзеяздольнасць. У прыватнасці, адказнасць натарыусаў за злоўжыванні і хібы была зафіксавана ў «Палажэнні аб пакараннях крымінальных і папраўчых» ад 1845 г. Да пачатку сваёй працоўнай дзейнасці і потым штогод натарыусы павінны былі прадставіць у акруговы суд заклад, які служыў гарантыяй таго, што прынесеныя шкоды будуць кампенсаваныя. За парушэнні правілаў здзелкі, памылковыя дзеянні натарыус нёс матэрыяльную адказнасць і на час следства адхіляўся ад дзейнасці.

У 1867 г., калі паўстала прыкметная праблема аплаты працы, была ўведзена «часовая такса ўзнагароджання натарыусаў». Да гэтага натарыусы атрымлівалі дараванне па добраахвотным пагадненні з кліентам. Плата па

пагадненні выклікала падрыў даверу да натарыуса з боку насельніцтва, паколькі давала магчымасць для вымагальніцтваў і злоўжыванняў. Нягледзячы на неадназначнае прававое становішча, актуальнасць і запатрабаванасць прафесіі натарыуса не знізілася.

У заключэнні праведзенай работы можна сказаць, што гісторыя прававога рэгулявання нацыянальнага натарыята бярэ свой пачатак у Статутах Вялікага Княства Літоўскага (1529, 1566 і 1588 гг.). Шматлікія нормы і палажэнні Статутаў, асабліва пры параўнанні паміж сабой, сведчаць аб прагрэсіўным накірунку развіцця заканадаўства Вялікага княства Літоўскага. У гэты перыяд не ўжываецца слова «натарыус», але асобныя функцыі, уласцівыя натарыяту, выконваюць розныя службовыя асобы, у асноўным прысяжныя пісары. Статутнымі нормамі рэгламентаваўся парадак выбрання пасады земскага суддзі, падсудка і пісара. Прыводзіцца тэкст прысягі, якую яны прыносілі, заступаючы на пасаду. Акрэсліваецца іх прававое становішча і кампетэнцыя, парадак ажыцяўлення правасуддзя. З цягам часу і павялічэннем колькасці здзелак, неабходнасці пісьмовага афармлення асабліва раслі патрабаванні да кандыдатаў.

З увядзеннем Палажэння аб натарыяльнай частцы 1866 г. заканадавец адлучыў натарыяльную частку ад судовай і стварыў самастойны натарыяльны інстытут з шырокім і незалежным колам дзеянняў. З гэтага часу асобай, спецыяльна надзеленай уладай здзяйсняць і сведчыць натарыяльныя акты на тэрыторыі Беларусі, стаў натарыус.

Устаноўлена, што на працягу гістарычнай эвалюцыі натарыята Беларусі для яго былі характэрны імкненне да самастойнасці, пастаяннае павышэнне патрабаванняў да маральнай і прафесійнай падрыхтоўкі кандыдатаў, рост колькасці натарыяльных дзеянняў, удасканаленне натарыяльнага працэсу, павышэнне ролі і значэння натарыята ў грамадстве.

**Спіс выкарастаных крыніц:**

1. Skupienski, K. Notariat publiczny w średniowiecznej Polsce / K. Skupieni. – Lublin : Wyd-wo Uniw. Marii Curie-Sklodowskiej, 1997. – 543 s.

2. Беляев, И. Д. История русского законодательства / И. Д. Беляев. – СПб.: Лань, 1999. – 639 с.

3. Первый Литовский Статут (1529 г.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичюс. – Вильнюс: Margi raštai, 2004. – 522 с.

4. Доўнар, Т. І. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо; рэдкал. : Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 352 с.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.), А. І. Жураўскі, С. В. Кузьмін [і інш.]. – Мінск : БСЭ імя Пятруся Броўкі, 1989. – 573 с.

6. Свод законов гражданских [Текст]: (1 часть X тома Свода законов Российской империи по изданию 1857 г.), дополненный всеми позднейшими узаконениями и ссылками на статьи других томов свода, с алфавитным

указателем. – 2-е, испр. и доп. изд. – СПб.: Изд. Жиркевича и Зубарева, 1867. – 631 с.

7. Положение о нотариальной части от 14 апреля 1866 года // Свод законов Российской империи. Т. 16. Ч. 1: Судебные уставы. – СПб. : Л. Демис, 1866. – 392 с.